Гэта адчувальна, бо 60 працэнтаў сваёй прадукцыі мы экспартуем. Але апускаць рукі не ў нашых правілах, таму шукаем новыя рынкі збыту, выпускаем новую прадукцыю. Усяго нашы прадпрыемствы выпускаюць больш за чатыры з паловай тысячы відаў прадукцыі. Самыя пазнавальныя — трыбуны на стадыёне «Дынама», «Мінск-Арэне», Барысаў-Арэне» і іншых буйных спартыўных пляцоўках. Мы забяспечваем асвятленне вуліц у многіх гарадах, супрацоўнічаем з вядучымі прамысловымі прадпрыемствамі. Работы хапае ўсім.

Аднак галоўная задача нашых прадпрыемстваў — не толькі вытворчасць прадукцыі, але і сацыяльная адаптацыя невідушчых і слабавідушчых. І для гэтага шмат робіцца. На прадпрыемстве працуюць рэабілітолагі, інструктары па спорце, дзейнічае больш за 150 гурткоў па інтарэсах. 14 калектываў мастацкай самадзейнасці маюць званне народнага. Гэта, вядома, затратна: касцюмы, рэпетыцыі, паездкі і гэтак далей. Але мы разумеем, што ўсё для таго, каб чалавек мог працаваць і развівацца ў розных кірунках.

***— Алег Аляксандравіч, у вашай біяграфіі шмат цікавых старонак. Але, бадай, ці не самы цікавы факт, што вы скончылі Інстытут культуры. Чаму менавіта яго?***

— Калі прыйшоў час паступаць у інстытут, я ўжо быў майстрам спорту і мог без экзаменаў паступіць у інстытут фізкультуры. У мой час была такая показка: «Калі няма розуму, паступаў у «пед», калі няма культуры — у «мед», а калі ні розуму, ні культуры — у інстытут фізкультуры». А я проста ўзяў даведнік і, куды тыцнуў пальцам, туды і вырашыў падаваць дакументы. Так і трапіў у інстытут культуры. І не шкадую ні кроплі: на маёй рэжысёрскай спецыяльнасці былі выкладчыкі ад бога. Што такое рэжысёр? Гэта чалавек, які ўмее кіраваць людзьмі, арганізоўваць іх работу. Гэта важны навык у любой сферы дзейнасці. Галоўнае — напісаць сцэнарый, сабраць калектыў, зарадзіць яго ідэяй і не перашкаджаць камандзе працаваць. І мне тое вельмі дапамагае.

***— Вы чалавек, які бачыў станаўленне паралімпійскага руху ў нашай краіне. Зразумела, што за 30 гадоў усё карэнным чынам змянілася. А як пачыналася?***

— У мой час умоў для паралімпійцаў было на парадак менш, чым цяпер. Спартсмены працавалі ў імя энтузіязму і патрыятызму, гэта было вельмі важнае паняцце. Потым спорт стаў крыху прыносіць грошы. І, чаго хаваць, мы самі іх зараблялі. Многія савецкія спартсмены за мяжу везлі савецкую прадукцыю, адтуль — замежную тэхніку і нядрэнна на гэтым зараблялі. Мой самы вялікі «улоў» — у Японіі электрасамавар абмяняў на магнітафон, які потым прадаў за 1200 рублёў (за тыя грошы можна было купіць тры спальныя гарнітуры). Сёння гэта можа падацца дзікім, але тады падтрымка спартсменаў была далёка не такая, як цяпер, таму прыходзілася круціцца самастойна.

***— У пачатку года вас пераабралі на пасаду старшыні Нацыянальнага паралімпійскага камітэта. Алег Аляксандравіч, якія мэты ставіце перад сабой на наступныя чатыры гады?***

— Нашы мэты нязменныя і заўсёды важныя — працаваць над удасканаленнем заканадаўства, якое рэгламентуе паралімпійскі спорт, паляпшаць умовы для нашых спарстменаў. І, вядома, дабівацца вяртання на міжнародную арэну, дзе нашы спартсмены, я ўпэўнены, будуць паказваць яшчэ лепшыя вынікі.

Спорт-тайм

# АД РАЎБІЧ ДА МЕЛЬБУРНА

## Мінулы тыдзень напоўнены перамогамі беларускіх спартсменаў. Расказваем асноўныя з іх

**ПЕРАМОГА ТЫДНЯ.** Арына Сабаленка ўпершыню ў кар'еры заваявала тытул «Вялікага шлема». Беларуская тэнісістка стала пераможцай Адкрытага чэмпіянату Аўстраліі, з перамогай яе павіншаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. У гісторыі айчыннага тэніса такога поспеху дасягала толькі Вікторыя Азаранка, якая ў Мельбурне перамагала ў 2012 і 2013 гадах. У фінале Australian Open Арына Сабаленка сустрэлася з прадстаўніцай Казахстана Аленай Рыбакінай. Вынік сустрэчы — 4:6, 6:3, 6:4.



Арына адзначыла, што яе саперніца Алена Рыбакіна гуляла вельмі добра, выіграла першы сэт, і потым з ёй было вельмі цяжка змагацца. «Я не ведаю, што цяпер сказаць, проста вельмі шчаслівая, што заваявала першы такі трафей. Вельмі хачу хутчэй вярнуцца дадому і паказаць гэты аўстралійскі прыз сваім родным — маме і бабулі. Дзякуй вялікі ўсім, хто мяне падтрымліваў і хвараў за мяне!» — сказала яна. Перад стартам турніру ў Аўстраліі беларуска займала пяты радок у сусветным рэйтынгу. Перамога ў Мельбурне падняла яе на другую пазіцыю, забяспечыўшы ў актыве 6100 балаў. Паўфіналістка цяперашняга аўстралійскага першынства Вікторыя Азаранка перамясцілася з 24-й на 16-ю пазіцыю (2138 балаў). Яшчэ адна беларуска Аляксандра Сасновіч займае 37-е месца (1291).

У мужчынскім фінале Australian Open трафей заваяваў сербскі тэнісіст Новак Джокавіч, які абыграў грэка Стэфанаса Цiцiпаса — 6:3, 7:6 (7:4), 7:6 (7:5). Для 35-гадовага Новака Джокавіча гэта дзясятая вікторыя на кортах «Мельбурн-Парка». Цяпер у яго паслужным спісе 22 чэмпіёнскія тытулы на турнірах серыі «Вялікага шлема».

**ТУРНІР ТЫДНЯ.** У Раўбічах прайшоў пяты этап міжнародных спаборніцтваў па біятлоне «Кубак Садружнасці». Лідар агульнага заліку беларус Антон Смольскі ў мужчынскай спрынтарскай гонцы заняў трэцяе месца. А ў пасьюце Антон Смольскі размясціўся на другой пазіцыі. Беларус таксама стаў бронзавым прызёрам масстарту.

Лідар жаночага агульнага заліку беларуска Дзінара Алімбекава-Смольская стала другой у спрынце. А ў гонцы пераследу стала пераможцай. Гэта ўмацавала яе пазіцыі ўверсе агульнага заліку Кубка Садружнасці.

**ЦЫТАТА ТЫДНЯ.** «Адхіленне спартсменаў з-за іх пашпарта не адпавядае каштоўнасцям і місіі Алімпійскай хартыі. Магчыма, расійскія і беларускія спартсмены маглі б спаборнічаць пад нейтральным сцягам на Алімпійскіх гульнях 2024 года ў Парыжы», — цытуе прэзідэнта Міжнароднага алімпійскага камітэта Томаса Баха Spiegel.

На мінулым тыдні Алімпійскі савет Азіі (АСА) прапанаваў Беларусі і Расіі ўзяць удзел у Азіяцкіх гульнях. Турнір пройдзе з 23 верасня да 8 кастрычніка 2023 года ў кітайскім Ханчжоў. У некаторых відах спорту там будуць разыграны алімпійскія ліцэнзіі. У Алімпійскім савеце Азіі адзначылі, што вераць у аб'ядноўчую сілу спорту і ў тое, што ўсе спартсмены павінны мець магчымасць удзельнічаць у спаборніцтвах незалежна ад іх пашпарта. Як паведамляе газета The Indian Express, у выпадку ўдзелу беларускіх і расійскіх спартсменаў у Азіяцкіх гульнях для іх будзе створана спецыяльная сістэма адбору на Алімпіяду-2024 у Парыжы. Паводле слоў выконваючага абавязкі прэзідэнта Алімпійскага савета Азіі Рандхіра Сінгха, беларусы і расіяне не перашкодзяць азіяцкім атлетам размяркоўваць узнагароды і пуцёўкі на Алімпійскія гульні. Плануецца, што МАК сумесна з міжнароднымі спартыўнымі федэрацыямі вызначыць спецыяльную сістэму для беларусаў і расіян, каб і ў іх на Азіяцкіх гульнях была магчымасць кваліфікавацца на парыжскую Алімпіяду.

**Фота з адкрытых крыніц.**

Кузня чэмпіёнаў

# «Яны ахвяравалі дзяцінствам дзеля баскетбола»

## Юныя спартсмены гатовыя да барацьбы

**Міжнародны бан і палітычныя інтрыгі, ад якіх апошнім часам хістае вялікі спорт, не перашкаджаюць развіццю спартыўнага рэзерву. Крызіс калісьці скончыцца, і трэба сустрэць гэты час моцнымі і падрыхтаванымі. Юныя баскетбалісты ўзялі ўдзел у паўфінале міжрэгіянальнага турніру па баскетболе «Кубак Фенікса» сярод камандаў юнакоў 2008 года нараджэння.**

Нашу краіну прадстаўляла юнацкая зборная 2009 года нараджэння, гульцы якой вучацца ў Рэспубліканскім дзяржаўным вучылішчы алімпійскага рэзерву (РДВАР). Адмыслова для набыцця гульнявой практыкі трэнерскі штаб заявіў каманду ў старэйшую ўзроставую групу. Спецыялісты ўпэўненыя, што гэта пойдзе на карысць юным гульцам: у канкурэнцыі з дарослымі і больш вопытнымі сапернікамі павышаецца спартыўнае майстэрства. Для юнакоў сёння гэта самае галоўнае. У паўфінале турніру беларусы занялі чацвёртае месца. Аднак тут няма нагоды для суму. «Кубак Фенікса» — той самы выпадак, калі галоўнае — не перамога, а ўдзел.

Адкрыты міжрэгіянальны турнір па баскетболе «Кубак Фенікса» праводзіцца сярод юнакоў і дзяўчат ва ўзроставых катэгорыях ад 10 да 14 гадоў. У спаборніцтвах удзельнічаюць 180 камандаў з 38 гарадоў Расіі і Беларусі. «На першы погляд, беларуская і расійская школа баскетбола падобныя. Але ўсё ж такі ў расійскіх камандаў ёсць свае асаблівасці і падыходы. І нашым камандам будзе карысна пра тое даведацца. Гэтыя баскетбалісты ў будучыні ўвойдуць у склад нацыянальных зборных, і вельмі важна, каб у іх было як мага больш спаборніцкай практыкі», — адзначыла **генеральны сакратар — выканаўчы дырэктар Беларускай федэрацыі баскетбола Настасся МАРЫНІНА.**

У спорце, як і ў звычайным жыцці, вучацца на сваіх памылках. Таму маладым гульцам часам карысна памыліцца. Адмоўны вопыт — таксама вопыт. І такія турніры, як «Кубак Фенікса», даюць набыць патрэбныя веды і навыкі.

«Наша мэта — падрыхтоўка рэзерву для нацыянальнай каманды. Мы працуем над развіццём індывідуальнай тэхнікі і індывідуальнай тактыкі. Індывідуальная тэхніка — тое, што яны ўмеюць рабіць з мячом, а індывідуальная тактыка — разуменне гульні. Вельмі важна не ўпусціць спартсмена ў 13-14 гадоў. У гэтым узросце яны праходзяць вельмі сур'ёзную школу падрыхтоўкі, прывыкаюць да дысцыпліны. Пачынаюць задумвацца над будучыняй, усведамляюць, ці хочуць рэалізаваць сябе як спартсмены альбо лепш абраць нешта іншае. Але,



на шчасце, усе, хто сабраны ў гэтай камандзе, мараць аб высокім, ставяць вялікія мэты і ідуць да іх кожны дзень», — адзначае **Аляксей СЯЛЕНЯ, старшы трэнер мужчынскай каманды па баскетболе U-14.** Па словах трэнера, графік у каманды насычаны, гульнявой практыкі хапае: «У нашай краіне шмат камандаў старэйшага ўзросту, з якімі мы можам саперніцаць. Так, мы не заўсёды іх перамагаем, але галоўнае — атрымаць гульнявы досвед. Хлопцам карысна праводзіць матчы, дзе яны могуць уступіць дваццаць балаў і ўбачыць свае слабыя бакі. Патрэбныя матчы, дзе яны выйграюць два балы, каб убачылі, што такое барацьба да апошняга. Таму «Кубак Фенікса» для нас — выдатная магчымасць атрымаць гульнявую практыку, сустрэцца з добра падрыхтаванымі камандамі. Хлопцам вельмі карысна ўбачыць розныя школы падрыхтоўкі. У нас, напрыклад, не прынята гуляць зонавыя абароны, мы гуляем асабіста і ўсё прыкладна адно і тое ж у абароне. А сустракаючыся з рознымі камандамі, бачыш разнастайнасць трэнерскай думкі ў абароне і нападзенні. Сёння гуляеш супраць асабістай абароны, заўтра — супраць зонавай абароны, потым гуляеш супраць зонавага прэсінгу — і ўсяму вучышся», — дзяліцца Аляксей Сяленя.

### Алімпійская кроў

Сваю каманду трэнер называе ўнікальнай. Нягледзячы на юны ўзрост, хлопцы паводзяць сябе як дарослыя адказныя спартсмены. Прыклад усёй камандзе задае **капітан Сямён ГУРАЛЬ.** «Графік у каманды сур'ёзны: па дзве трэніроўкі на дзень, яшчэ трэба вучыцца ў школе. Але кожны хлопец разумее, дзеля чаго тое трэба. Яны ўсе з'ехалі з дому, ахвяравалі сваім дзяцінствам, адмовіліся ад гурткоў, дзіцячых забаваў. Нягледзячы на ўзрост, гэта дарослыя людзі», — расказвае ён.

«Разыначка» каманды U-14 і ў тым, што ў ёй прысутнічае алімпійская кроў. Іван Багдановіч — сын алімпійскага чэмпіёна 2008 года па веславанні на байдарках і каноэ Аляксандра Багдановіча. Аляксей Сяленя адзначае, што Багдановіч-малодшы — фізічна моцны хлопец з характарам пераможца. Захар Барбашынскі — малодшы сын алімпійскага чэмпіёна 1992 года, гандбаліста Андрэя Барбашынскага. Цікава, што калісьці баскетбольную будучыню прадракалі і самому Андрэю Барбашынскаму, але перамог гандбол. А вось нашчадак, па словах Андрэя Станіслававіча, цвёрда і ўпэўнена абраў баскетбол. «Усе кажуць, што мы з Захарам — копія адзін аднаго. Спецыялісты адзначаюць, што ён добра арыентуецца на пляцоўцы. Ім усім сёння не хапае моцы, агульнай фізічнай падрыхтоўкі, але тое можна выправіць. Самае галоўнае, што ў Захара ёсць мэта, мэтанакіраванасць, жаданне — дзякуй генам. У мяне ў яго ўзросце таксама былі мэта і жаданне дасягнуць яе. Захар уважліва ставіцца да заняткаў спортам, не ўхіляецца, трэніруецца па два разы на дзень. Жадання ў яго не адабраць, і мы як бацькі гэта толькі падтрымліваем», — дзеліцца Андрэй Барбашынскі. Алімпійскі чэмпіён падкрэсліў, што цяпер у хлопцаў адказны ўзрост — ім трэба пацвердзіць сваё ўменне і жаданне займацца спортам, максімальна праявіць сябе. Няпроста. Але ж ніхто не гарантаваў, што ў вучылішчы алімпійскага рэзерву будзе лёгка. Андрэй Барбашынскі ведае пра тое як ніхто іншы, таму і ўсяк падтрымлівае сына.

Па выніках першага тура «Кубка Фенікса» найлепшым гульцом РДВАР быў прызнаны Яраслаў Гесць, малодшы брат «галоўнага чэмпіёна беларускага баскетбола» Рамана Гесця. Раман таксама прайшоў вучылішча алімпійскага рэзерву, выступаў за клуб «Мінск», абараняў гонар краіны на чэмпіянатах Еўропы. А летась перамог страшную хваробу і вярнуўся ў родны клуб у якасці трэнера. «Думаю, у Яраслава ёсць будучыня ў баскетболе. Калі яму пашанцуе і ён вырасце хоць бы да 195 сантыметраў, будзе выдатны гулец для зборнай Беларусі. Ён жыве баскетболам, як і я. Мне падабаецца, як брат працуе, ён выкладваецца на максімум. Апроч трэніровак, пастаянна глядзіць розныя матчы, ролікі — актыўна цікавіцца баскетболам. Мне імпануе такі падыход», — дзеліцца Раман.

Няхай «Кубак Фенікса» не сабраў тысячы аматараў, няма сумненняў, што юныя баскетбалісты яшчэ будуць выступаць перад поўнымі трыбунамі. А пакуль яны крок за крокам, турнір за турнірам ідуць да мэты. І самае галоўнае для іх — вера і падтрымка. Наперад, хлопцы!

**Фота Беларускай федэрацыі баскетбола.**

**Матэрыялы выпуску падрыхтавала Валерыя СЦЯЦКО.**